чимые различия по сравнению с мальчиками «нетеатралами» по десяти шкалам, а девочки только по двум.

3.Сравнивая количество объектов и субъектов, вызывающих эмоциональный отклик старшеклассников, было выявлено: количество таких объектов у «театралов» составляет 70, а у «нетеатралов – 45. Гендерные различия отсутствуют. Изучая эмоциональную направленность старшеклассников, мы выявили, что учащиеся экспериментальных классов выделили 11 направлений своей эмоциональной жизни, в то время как учащиеся контрольных классов 10.

4. Учащиеся-«театралы» лучше, чем «нетеатралы» умеют контролировать и регулировать свои эмоции и чувства. Они вербализовали 13 категорий, в том числе такие, как осознание своего эмоционального потенциала и потенциала других людей, осознание своих эмоций как оценочных, вызов положительных и устранение отрицательных эмоций. Учащиеся-«нетеатралы» вербализовали лишь10 категорий.

Таким образом, доказано, что театральное образование способствует эмоциональному развитию личности старшеклассников.

**У.І.Бялоў,** *дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧАГА ЎЯЎЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ НА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАХ ПА РАСПРАЦОЎЦЫ ПРАГРАМ

Культурна-адпачынкавая праграма адлюстроўвае сінтэтычную дзею, якая складаецца са слова, пластыкі, музыкі, святла і інш. Задумваючы культурна-адпачынкавую праграму, сацыяльны педагог плануе яе сэнсавую і эмацыянальную структуру, якую адлюстроўвае ў сцэнарыі.

Галоўная мэта рэжысёра – у пошуку арыгінальнага рашэння творчай задумы. Для поспеху ў рэжысёрскай працы неабходна,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каб студэнты авалодалі асаблівасцямі рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. У аснову навучання рэжысуры пакладзена творчая і педагагічная практыка К.С.Станіслаўскага і яго паслядоўнікаў.

Навучальны працэс дае магчымасць студэнтам засвоіць прынцыпы і прыёмы рэжысуры, асаблівасці работы над нумарам, над рэалізацыяй культурна-адпачынкавай праграмы.

Методыка выкладання дапускае вывучэнне раздзелаў паэтапна. На першым этапе фарміруюцца індывідуальныя якасці валодання элементамі акцёрскага майстэрства (выканальніцкі трэнінг); на другім этапе выпрацоўваюцца ўменні і навыкі работы рэжысёра над нумарам, а потым над культурна-адпачынкавай праграмай.

Арганізацыйным якасцям, творчым здольнасцям сацыяльны педагог павінен навучыцца ў працэсе лекцыйных, практычных і індывідуальных заняткаў.

Практычныя заняткі ўключаюць шэраг узаемазвязаных элементаў. Гэта пастаноўка іх мэты; абмеркаванне заданняў і сродкаў дасягнення канчатковых вынікаў; улік сістэмы прафесійных ведаў, якія забяспечваюць поспех творчай роботы; кантроль за выкананнем заданняў.

Практычныя заняткі па «Рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм» са студэнтамі першага курса спецыялізацыі «сацыяльны педагог» накіраваны на развіццё іх творчага ўяўлення. Ставіцца задача выявіць творчы тып мыслення студэнтаў, каб скарэкціраваць іх творчыя магчымасці ў развіцці ўяўлення.

Для рашэння гэтай задачы неабходна скласці апавяданне па карціне. Студэнтам прапануецца ўважліва разгледзець карціну В.Макоўскага «На бульвары» і апісаць тое, што, на іх погляд, з'яўляецца цікавым. Апісанне карціны пятнаццаццю студэнтамі аналізавалася па асобай методыцы, вынікі класіфікаваны ў тры групы:

– адказы сухія, лаканічныя, разважлівыя, канстатуючыя;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– адказы эмацыянальныя, экспрэсіўныя, якія характарызуюцца прысутнасцю працэсу «ўжывання» ў карціну, у вобразы асоб і навакольную прыроду;

– апісанне карціны вядзецца ад першай асобы або ад імя прыдуманага персанажа.

Аналіз студэнцкіх пісьмовых работ даў магчымасць адзначыць, што:

– першую групу адказаў характарызуе тып мысліцельны;

– адказы другой групы хутчэй адпавядаюць мастацкаму тыпу;

– трэцяя група адказаў адпавядае тыпу вобразнаму, акцёрскаму.

Устанаўленне тыпаў мыслення студэнтаў дае магчымасць выкладчыку распрацаваць індывідуальны падыход да кожнага з іх і больш эфектыўна развіваць іх творчае ўяўленне ў далейшай рабоце.

На практычных занятках студэнты атрымалі творчае заданне распрацаваць праграму на тэму «Дарагая мая жанчына». З мэтай актывізацыі творчага ўяўлення студэнтаў забаранялася крытыка ідэй, падтрымлівалася ўсё тое, што прапаноўвалася ў працэсе выканання заданняў.

Кожны студэнт, выкарыстоўваючы вопыт і прафесійныя веды, атрыманыя на лекцыйных занятках, ствараў задуму пастаноўкі, свае меркаванні фіксаваў на паперы. Аналіз паказаў, што большасць студэнтаў ішлі ў сваёй працы па вядомым шляху. Яны выкарыстоўвалі знаёмыя вершы, прысвечаныя жанчыне, і вакол іх стваралі паэтычную кампазіцыю. Некалькі студэнтаў зрабілі спробу адысці ад шаблону і паказалі арыгінальнае бачанне тэмы. У іх задуме лейтматывам праз усю пастаноўку праходзіла тэма вернасці жанчыны, яе ўменне чакаць каханага.

Праграма мела пяць блокаў. У змесце кожнага з іх адлюстроўвалася падзея, у цэнтры якой быў вобраз жанчыны. Гэты падыход даваў магчымасць выкарыстоўваць у якасці матэрыялу для пастаноўкі урыўкі з мастацкіх твораў, п'ес, мемуараў. Музычным лейтматывам была песня на верш М.Забалоцкага «Дарагая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мая жанчына». Пры далейшай «мазгавой атацы» ўсіх студэнтаў па гэтай задуме сюжэтны ход стаў больш канкрэтным, з'явіліся новыя элементы. На наш погляд, цікавым было выкарыстанне рушнікоў, якія трансфармаваліся ў вобразы дрэў, дарогі, акенца і інш., што давала магчымасць узмацніць вобразнае рашэнне тэмы.

Такім чынам, у працэсе развіцця творчага ўяўлення студэнтаў на працягу заняткаў неабходна:

– вызначыць актуальную тэму, ідэю;

– акцэнтаваць увагу на галоўным у выбранай тэме;

– генерыраваць ідэі шляхам распрацоўкі рознабаковых падыходаў да тэмы;

– выбраць аптымальны арыгінальны варыянт задумы для далейшай яе распрацоўкі;

– генерыраваць новыя ідэі ў абраным напрамку да канчатковага ажыццяўлення задумы творчай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**П.В.Войницкий,** *преподаватель*

## ОПЫТ ПРОВЕДЕНИЯ СКУЛЬПТУРНОГО ПЛЕНЭРА ДЛЯ ДЕТЕЙ-ИНВАЛИДОВ С ОСОБЕННОСТЯМИ ПСИХОФИЗИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ

Пленэр был проведен в августе–октябре 2002 г. и завершился 28 ноября установкой скульптур на территории дома-интерната для детей-инвалидов с особенностями психофизического развития. Шестеро скульпторов-профессионалов: С.Аганов, Н.Дробыш, В.Колесинский, А.Ткачук, Г.Шамара и автор этой статьи, выступивший в качестве руководителя проекта, – создали на волонтерских началах несколько скульптур из камня в парке перед домом-интернатом. Благодаря финансовой поддержке East European Herritage Projekt (исполнительный директор Franklin J.Swarts) были приобретены материал (гранит) для работы, а также электроинструмент, необходимый для его механической обработки. Ад-